**Інфармацыйны ліст**

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ УСТАНОВА
«НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ»
МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

запрашае прыняць удзел

у АДКРЫТЫМ ДЫСТАНЦЫЙНЫМ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІМ МАРАФОНЕ «ЧАС ВЫМЯРАЕЦЦА ПАМЯЦЦЮ»

Марафон праводзіцца з мэтай захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і прымеркаваны да Года гістарычнай памяці.

**Асноўныя задачы мерапрыемства:**

- захаванне гістарычнай памяці сваёй краіны;
- выхаванне ў вучняў грамадзянскасці і патрыятызму;
- знаёмства з унікальнай спадчынай і традыцыямі розных рэгіёнаў Беларусі;
- падтрымка творчых ініцыятыў;
- спрыянне развіццю інфармацыйнай культуры ўдзельнікаў марафону.

Да ўдзелу ў марафоне запрашаюцца вучні I–XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама ўсе зацікаўленыя (педагогі, законныя прадстаўнікі (бацькі) і інш.).

З мэтай рэалізацыі мерапрыемства на нацыянальным адукацыйным партале адкрыты раздзел для публікацыі творчых праектаў (работ). Удзельнікам марафону даецца магчымасць падзяліцца на старонках партала сваімі праектамі па наступных намінацыях:

- **«Шляхам гісторыі»** – віртуальны альбом электронных або аўдыявізуальных даведнікаў, пуцевадзіцеляў па славутых мясцінах, гістарычных маршрутах, музеях; тапаграфічных схем (карт) з пазначанымі гісторыка-культурнымі аб’ектамі і іх апісаннем; фота-, відэарэпартажаў аб падарожжы.
- **«Гістарычны хранограф»** – прадстаўленне культурных падзей, фактаў, дат, звязаных з рэгіёнам (нарысы, замалёўкі, эсэ, апавяданні, іншыя літаратурна-мастацкія, публіцыстычныя тэксты; мастацкія фатаграфіі, фотапрэзентацыі, відэаматэрыялы; творы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, скульптуры, дызайну і г. д.).
- **«Гістарычная прастора»** – віртуальны альбом праектаў ці асобных прапаноў па добраўпарадкаванні прыродных і гісторыка-культурных аб’ектаў, фота-, відэасправаздачы з апісаннем самога аб’екта ці наладжанай акцыі.
- **«Гісторыя ў асобах»** – знаёмства з самабытнай асобай (калектывам) (эсэ, нататкі, сачыненні, уражанні, вершы, апавяданні іншыя літаратурна-мастацкія, публіцыстычныя тэксты; мастацкія фатаграфіі, фотапрэзентацыі, відэаматэрыялы).
- **«Наша Спадчына»** – віртуальны альбом *фальклорна-этнаграфічных твораў*, якія адлюстроўваюць жыццё, каштоўнасці, побыт беларускага народа (песні, прыпеўкі, паданні, казкі, танцы, абрады і інш.); *фларыстычных работ* (букетаў, кампазіцый, пано, калажаў) з разнастайных прыродных матэрыялаў (кветак, лісця, траў, ягад, пладоў, арэхаў і інш.), пры жаданні праекты могуць быць праілюстраваны цытатамі з літаратурных твораў; *вырабаў беларускіх*

*рамёстваў*, якія дэманструюць непаўторнасць традыцыйнай нацыянальнай культуры (вырабы з саломкі і тканіны, цацкі, ганчарнае мастацтва, роспіс, разьба па дрэве, беларускі народны касцюм і інш.); *твораў выяўленчага мастацтва* (скульптура, жывапіс, графіка, фотамастацтва, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і інш.).

У кожнай намінацыі прымаюцца асобныя работы або тэматычныя цыклы, выкананыя ў розных тэхніках і пераведзеныя ў электронны фармат, а таксама матэрыялы, створаныя сродкамі сучасных інфармацыйна-камунікацыйных (ці медыя-) тэхналогій.

Праекты (творчыя работы) прадстаўляюцца не больш чым у адной намінацыі (на выбар) на беларускай ці рускай мовах як асобнымі ўдзельнікамі, так і аўтарскімі калектывамі.

*Якасць творчых праектаў (работ) павінна пацвярджацца рэкамендацыяй метадычнага аб'яднання па вучэбным прадмеце ці намесніка дырэктара ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі. Работы з граматычнымі памылкамі публікавацца не будуць.*

Тэрмін правядзення: **люты–кастрычнік 2022 года.**

Усе ўдзельнікі марафону атрымаюць электронныя сертыфікаты.

Для ўдзелу ў мерапрыемстве неабходна падаць **заяўку па ўстаноўленай форме** і накіраваць разам з ёй творчую работу і рэкамендацыю з установы адукацыі на электронны адрас: adumetod@adu.by з абавязковай пазнакай у тэме пісьма «Адкрыты дыстанцыйны культурна-асветніцкі марафон „Час вымяраецца памяццю“». Сваёй заяўкай удзельнік пацвярджае аўтарства работы і згоду з умовамі правядзення мерапрыемства. Заяўкі, афармленыя не ў адпаведнасці з патрабаваннямі і дасланыя несвоечасова, разглядацца не будуць.

Метадычную і тэхніка-тэхналагічную падтрымку мерапрыемства забяспечвае ўпраўленне дыстанцыйных адукацыйных паслуг НІА.

**Кантактная інфармацыя:**

220004, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, вул. Караля, д. 16, каб. 219;
тэлефоны: +375 17 358 63 91,
+375 17 318 42 71,
+375 17 200 51 27;
e-mail: adumetod@adu.by;
Г. М. Юсцінская, І. У. Борычава,
В. П. Васілевіч, В. А. Ганчарык.

*Дадатак*

Заяўка
на ўдзел у адкрытым дыстанцыйным культурна-асветніцкім марафоне
«Час вымяраецца памяццю»

| **ІНФАРМАЦЫЯ ПРА ЎДЗЕЛЬНІКА** | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку (*цалкам*) | |
| Кантактны тэлефон | |
| Электронная пошта | |
| **ІНФАРМАЦЫЯ ПРА ЎСТАНОВУ АДУКАЦЫІ, ЯКУЮ ПРАДСТАЎЛЯЕ ЎДЗЕЛЬНІК** | |
| Поўная назва ўстановы адукацыі | |
| Клас, у якім вучыцца ўдзельнік | |
| **ІНФАРМАЦЫЯ ПРА МЕСЦА ПРАЦЫ (ДЛЯ ДАРОСЛЫХ УДЗЕЛЬНІКАЎ)** | |
| Поўная назва месца працы | |
| Пасада | |
| **ІНФАРМАЦЫЯ ПРА ТВОРЧУЮ РАБОТУ** | |
| Жанр і назва работы | |
| Назва намінацыі | |

**Заўвагі:**

1. Калі творчая работа выканана аўтарскім калектывам, у заяўцы ўказваюцца звесткі пра кожнага ўдзельніка.
2. Усе пазіцыі ў заяўцы павінны быць запоўнены.
3. Заяўка, аформленая не ў адпаведнасці з патрабаваннямі і дасланая несвоечасова, **разглядацца не будзе**.